ВЁСНЫ ЛЕАНІДА ПУГАЎКІ

РАСКАЗЫ АБ КАМУНІСТАХ

Генеральны сакратар ЦК КПСС Леанід Ільіч Брэжнеў у Справаздачным дакладзе Цэнтральнага Камітэта XXV з'езду КПСС гаварыў: **«Важнейшы вынік прайшоўшага шасцідзесяцігоддзя — гэта савецкі чалавек. Чалавек, які змог, заваяваўшы свабоду, адстаяць яе ў самых цяжкіх баях. Чалавек, які будаваў будучыню, не шкадуючы сіл і ідучы на любыя ахвяры. Чалавек, які прайшоў усе выпрабаванні, сам непазнавальна змяніўся, аб'яднаў у сабе ідэйную перакананасць і велізарную жыццёвую энергію, культуру, веды і ўменне іх прымяняць. Гэта — чалавек, які, будучы патрыётам, быў і заўсёды будзе паслядоўным інтэрнацыяналістам».**

Аб адным з такіх савецкіх людзей і хочацца расказаць.

Ён прайшоў праз усе выпрабаванні жыцця. Перада мною пажоўклы ад часу нумар франтавой газеты «Сталінец» за 11 лістапада 1944 года. «Пад моцным агнём праціўніка сапёры ішлі ўздоўж шасейнай дарогі, ачышчаючы яе ад варожых мін і фугасаў. Гэта была вельмі рызыкоўная аперацыя, і вызначылася ў ёй група сапёраў пад камандаваннем камандзіра аддзялення Пугаўкі. Камандаванне танкавага падраздзялення выказала падзяку сапёрам за ўменне і адвагу». А вось яшчэ некалькі радкоў з другой газеты часоў вайны: «Далёка за межамі нашага падраздзялення вядомы імёны герояў-сапёраў, такіх, як кавалер ордэнаў Славы III і II ступеней старшага сяржанта Леаніда Пугаўкі...».

А цяпер звернемся да друкаваных радкоў больш позняга часу, перагорнем старонкі часопіса «Знамя» за снежань 1961 года. Тут надрукаваны артыкул, у якім гаворка ідзе аб Днях рускай літаратуры ў Беларусі. Сярод удзельнікаў гэтых дзён быў і вядомы паэт Міхаіл Святлоў. Вось што пра гэта сказана ў часопісе: «З многіх беларусаў, якіх мы сустрэлі ў паездцы, Святлоў асабліва выдзеліў для сябе яшчэ аднаго чалавека. Вось што Міхаіл Святлоў сказаў на святочным прыёме, наладжаным у гонар завяршэння Дзён рускай літаратуры ў Беларусі:

— Тут было выказана шмат высокіх слоў, якія праслаўляюць дружбу народаў, Расію, Беларусь, паэзію. Я хачу тут успомніць чалавека, які нават сярод сціплых беларусаў вызначаецца сваёй сціпласцю. Вы, вядома, ведаеце гэтага чалавека. Я кажу пра Леаніда Пугаўку — славутага старшыню калгаса «17 Верасня». Само існаванне такіх людзей успрымаеш, як падарунак. Я прапаную тост за Пугаўку. Да чаго ж добра прышыга гэта пугаўка да Савецкай улады!».

У вёсцы Бабічы — цэнтры калгаса «17 Верасня» — свята. Наехала шмат гасцей: навакольныя і больш далёкія суседзі завіталі, з раённага цэнтра Глыбокае прыйшло некалькі аўтобусаў і «газікаў». Устаноўленыя на балконе калгаснага клуба дынамікі разносяць музыку, песні. Калгаснікі ўрачыста адзначаюць чвэрць стагоддзя сваёй калектыўнай гаспадаркі. Свята ўдвая радаснае — дваццаць пятую вясну калгаснікі сустракаюць разам са сваім нязменным старшынёй, усімі паважаным чалавекам Леанідам Канстанцінавічам Пугаўкам.

Віншаванні, цёплыя, шчырыя словы. Усё, як і належыць на юбілеі. Клуб перапоўнены, людзі нават у праходах. «Трэба будаваць новы, у гэтым ужо цесна», — падумалася старшыні.

Яму многае ўспомнілася. Грамадзянінам Краіны Саветаў ён, Леанід Пугаўка, як і яго землякі, стаў у верасні 1939 года. Праз год пайшоў на службу ў рады Чырвонай Арміі. Тут яго і застала Вялікая Айчынная вайна.

Многа зведаў ён за гады вайны. Не мог не ўспомніць пра перажытае ў гэты дзень. А ці ж можна забыць сход, на якім сяляне пяці невялікіх калгасаў выбіралі яго старшынёй аб'яднанай гаспадаркі? У пракуранай, перапоўненай людзьмі хаце гарэла адна-адзіная газоўка, за печкай было цёмна. Адтуль і даносіліся галасы: «З калгаса твайго нічога не выйдзе! Дарэмна стараешся, Пугаўка».

Успомнілася і такое: першую аўтамашыну калгас атрымаў у 1952 годзе. Вельмі ўзрадавалі-ся, але ў гаспадарцы не знайшлося чалавека, які б нешта разумеў у машынах. І каб прыгнаць з горада грузавік, прыйшлося наймаць шафёра. Цяпер жа ў калгасе 30 аўтамашын розных марак, 29 трактараў, 16 камбайнаў. Тэхніку абслугоўваюць 103 механізатары.

У першы год стварэння калгаса яго працаўнікі сабралі збожжавых па восем цэнтнераў з гектара. Мала радасці было ад такога ўраджаю. А летась тут атрымалі па 25 цэнтнераў збожжа. Сёлета хлебаробы абавязаліся сабраць па 31 цэнтнеру з гектара. Высокія абавязацельствы прыняты па вырошчванню бульбы, ільну.

«Хата пад саламянай страхой? Ці бывае такое?» — здзіўлена пытаюць школьнікі. Іх бацькі не здзіўляюцца, яны гэта добра памятаюць. Памятаюць і тое, што яшчэ пятнаццаць гадоў назад на тым месцы, дзе сёння праляглі прыгожыя вуліцы цэнтральнай вёскі Бабічы, была пустэча. Пабывайце сёння ў вёсках калгаса, палюбуйцеся імі. Не без гордасці вам пакажуць калгасны клуб, бібліятэкі, камбінат бытавога абслугоўвання. У цэнтры калгаса — бальнічны гарадок, аптэка. Прыгожыя, утульныя дамы. У гэтым вялікая заслуга іх старшыні, які праяўляе вялікія клопаты аб быце і адпачынку хлебаробаў. Можа іменна таму яны выбіралі свайго старшыню дэпутатам Вярхоўнага Савета Саюза ССР.

Усіх радуе вясна. Леаніда Пугаўку асабліва, бо з гэтай парой звязаны многія важныя падзеі ў яго жыцці. Вясною 45-га, незадоўга да Перамогі над фашысцкай Германіяй, ён уступіў у Камуністычную партыю. Вясною 50-га ўзначаліў Узвенскі сельскі Савет, а роўна праз год быў абраны старшынёю калгаса, якім і сёння кіруе.

Сёння яго запрасілі ў мясцовую школу. Аб чым расказаць маленькім аднавяскоўцам? Аб тым, як ён, сын селяніна-беднякa, не змог атрымаць у буржуазнай Польшчы ніякай адукацыі і што яго школай, універсітэтам стала само жыццё? А можа расказаць ім пра дзядоў і бацькоў — непахісных барацьбітоў за родную Савецкую ўладу? Так, ён і расказаў піянерам пра подзвіг старэйшых, пра герояў вайны, якімі так багата родная беларуская зямля.

— Леанід Канстанцінавіч, а цяпер раскажыце пра свае ўзнагароды, — просяць дзеці.

— Пра Зорку Героя мы ведаем — гэта за працу ў нашым калгасе. А вось пра іншыя ўзнагароды.

— Як гэта было? — задумаўся Пугаўка. — Было, як на вайне. Была вядомая на ўвесь свет Арлоўска-Курская дуга. Былі жорсткія баі, за адзін з іх — ордэн Славы III ступені. А потым мы прыйшлі ў Карпаты. Там таксама ішлі жорсткія баі, за кожную вышыню, кожны перавал. За гэта — ордэн Чырвонай Зоркі.

— За фарсіраванне ракі Одэр я быў узнагароджан ордэнам Славы II ступені, а яшчэ адзін ордэн Чырвонай Зоркі — за штурм Берліна...

...Як гэта было? Такое не забудзецца ніколі, але ў свята Перамогі ўсё ўспамінаецца больш востра і глыбока. Гэта добра, што ім, дзецям, якія ніколі не зналі вайны, хочацца ведаць, якой цаной дасталася Перамога, мірная праца іх бацькоў, іх школа, спартыўная пляцоўка, радасць жыцця.

Чалавек, які змог, заваяваўшы свабоду, адстаяць яе ў самых цяжкіх баях. Чалавек, які будаваў будучыню, не шкадуючы сіл, ідучы на любыя ахвяры. Чалавек, які, прайшоўшы ўсе выпрабаванні, сам непазнавальна змяніўся, аб'яднаў у сабе ідэйную перакананасць і велізарную жыццёвую энергію, культуру, веды і ўменне іх прымяняць...

Гэтыя цудоўныя, поўныя глыбокага сэнсу і душэўнай прыгажосці словы пра савецкага чалавека цалкам адносяцца да камуніста, Героя Сацыялістычнай Працы, мужнага салдата Вялікай Айчыннай вайны, старшыні калгаса «17 Верасня» Глыбоцкага раёна Леаніда Канстанцінавіча Пугаўкі.

Л. СТУДЗЕНЫ.

Глыбоцкі раён.